**В. І. Саітава,** *прафесар кафедры*
*тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
**І. М. Стрыжонак,** *дацэнт кафедры*
*тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый*

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ БУДУЧЫХ БІБЛІЯТЭКАРАЎ-КРАЯЗНАЎЦАЎ

Падмурак прафесійнай кампетэнцыі будучых бібліятэкараў-краязнаўцаў закладаецца пры вывучэнні агульнапрафесійных дысцыплін («Дакументалогія», «Тэорыя інфармацыі і камунікацыі», «Бібліятэказнаўства. Тэорыя, гісторыя», «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя, гісторыя» і інш.). Аднак грунтоўная падрыхтоўка студэнтаў да рэалізацыі краязнаўчай функцыі бібліятэкі ажыццяўляецца ў межах дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства», якая выкладаецца для большасці груп дзённай і завочнай форм навучання і, асабліва, дысцыплін спецыялізацыі. Разуменне сутнасці бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства адбываецца падчас вывучэння «Бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства» і тэарэтычных раздзелаў дысцыплін спецыялізацыі. Дысцыпліны спецыялізацыі накіраваны на набыццё навыкаў практычнай дзейнасці па краязнаўстве, авалоданне яе тэхналогіямі. Сукупна гэтыя дысцыпліны садзейнічаюць фарміраванню ўзаемазвязаных структурных кампанентаў прафесійнай кампетэнцыі спецыяліста ў галіне бібліятэчнага краязнаўства: кагнітыўнага, аперацыйнага, аксіялагічнага і дзейнасна-паводзінскага.

*Кагнітыўны* кампанент вызначае кола тэарэтыка-метадалагічных і гістарычных ведаў аб бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве, яго месцы і сувязях з такімі грамадскімі сістэмамі, як краязнаўства і бібліятэчна-бібліяграфічная дзейнасць. *Аперацыйны* кампанент прадугледжвае прымяненне набытых тэарэтыка-метадалагічных і гістарычных ведаў пры вырашэнні прафесійных задач. Ён фарміруецца ў ходзе паспяховага авалодання тэхналогіямі краязнаўчай дзейнасці ў вучэбным працэсе і праз шматлікія прыклады рэальнага ўкладу студэнтаў у краязнаўчую дзейнасць бібліятэк. *Аксіялагічны* кампанент выяўляе цэннасныя адносіны будучага бібліятэкара-краязнаўцы да рэалізацыі краязнаўчай функцыі бібліятэкі. *Дзейнасна-паводзінскі* кампанент паказвае здольнасць актыўна прымяняць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

веды і ўменні пры вырашэнні прафесійных задач, якія мэтанакіравана мадэлююцца ў вучэбным працэсе, і/ці з'яўляюцца рэальнымі сітуацыямі падчас вытворчай практыкі і падрыхтоўкі дыпломных работ.

Змястоўнае напаўненне вучэбных дысцыплін суадносіцца з задачамі практычнай дзейнасці бібліятэк па краязнаўстве і прадугледжвае авалоданне студэнтамі тэарэтыка-метадычнымі, арганізацыйнымі, тэхналагічнымі ведамі і ўменнямі па наступных напрамках: тэарэтычныя і гістарычныя веды, тэрмінасістэма бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства, краязнаўчая функцыя бібліятэкі («Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства», тэарэтычныя раздзелы дысцыплін спецыялізацыі, «Гісторыя краязнаўства і краязнаўчай бібліяграфіі»); выяўленне краязнаўчых дакументаў, іх кумуляцыя і стварэнне краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі («Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства», «Інфармацыйныя краязнаўчыя рэсурсы», «Краязнаўчае крыніцазнаўства» і г. д.).

Выкладчыкі дысцыплін бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства найважнейшае значэнне надаюць укараненню актыўных і інтэрактыўных метадаў навучання. Інтэрактыўныя метады, ці іх элементы, уключаюцца ва ўсе формы заняткаў. Чытаюцца праблемныя лекцыі, лекцыі-візуалізацыі, лекцыі з разборам канкрэтных сітуацый. Элементы інтэрактыўнасці ўключаюцца ў лекцыі. Так, на лекцыях-візуалізацыях вучэбны матэрыял паказваецца ў электронных прэзентацыях. На гэтых лекцыях студэнты ўзаемадзейнічаюць з інфармацыяй, выкладчыкам і паміж сабой. Лекцыя-візуалізацыя дапамагае сканцэнтраваць увагу на найбольш значных аспектах і асаблівасцях тэмы, садзейнічае яе разуменню і засваенню. Напрыклад, электронная прэзентацыя па тэме «Тапаніміка рэгіёнаў Беларусі» ўтрымлівае блок візуальнай інфармацыі, прысвечанай зменам назваў населеных пунктаў, прычынам, якія выклікалі перайменаванні. Як правіла, студэнты актыўна ўдзельнічаюць у абмеркаванні прычын, гістарычных умоў і наступстваў змен назваў, прыводзяць вядомыя ім факты са сваёй мясцовасці.

Выкарыстоўваюцца як традыцыйныя, так і інтэрактыўныя метады правядзення семінарскіх заняткаў: семінары-канферэнцыі, семінары-дыскусіі і інш. Так, семінар «Метадычныя асаблівасці рэкамендацыйных краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў» праводзіцца метадам мазгавога штурму. Атры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

малі развіццё практычныя і лабараторныя работы з элементамі трэнінгу, праектаў, выкананнем індывідуальных заданняў, рашэннем вытворчых сітуацый; праводзяцца дзелавыя гульні, выкарыстоўваюцца дыялогава-дыскусійныя метады. Практычныя работы з элементамі трэнінгу і выкананне індывідуальных заданняў праводзяцца па дысцыплінах «Бібліяграфаванне краязнаўчых дакументаў», «Індэксаванне краязнаўчых дакументаў» і інш. Шэраг з іх праходзіць у Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна, дзе разам з выкладчыкамі ў якасці трэнераў удзельнічаюць і супрацоўнікі аддзела краязнаўчай літаратуры. Пры распрацоўцы заняткаў і заданняў улічваецца, што засваенне матэрыялу, у тым ліку тэхналогій, дасягае 90 %, калі працэсы выконваюцца самастойна. Прыкладам бібліятэчнага праекта з’яўляецца «Хэлоін па-беларуску», праведзены студэнтамі 436 групы пад кіраўніцтвам дацэнта Н. Ю. Вайцэховіч у межах дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае абслугоўванне карыстальнікаў па краязнаўстве». Інавацыйнасць праекта заключаецца ў яго незвычайных форме і змесце, калі судовы працэс, ініцыяваны амерыканскімі персанажамі Хэлуіна, выйграюць беларускія міфалагічныя істоты (Зазоўка, Лазавік, Аржавеня, Вадзянік, Апіўня і інш.). У якасці «доказаў» выкарыстоўваюцца фрагменты кніг, фільмаў, вершы, прадметы, малюнкі і іншыя дакументальныя бібліятэчныя сродкі, якія раскрываюць найбагацейшыя ўяўленні беларусаў аб фантастычным свеце незвычайных істот. Праект яркі і атракцыйны, з вялікім асветным патэнцыялам.

Высокая ступень індывідуалізацыі практычных заданняў стымулюе персанальную адказнасць і зацікаўленасць, дае магчымасць праявіць прафесійныя веды і ўменні, арганізацыйныя здольнасці, схільнасць да асветніцтва, ацэнкі і прагнозу – тым самым праяўляецца функцыянальнасць прафесійнай кампетэнцыі бібліятэкара-бібліёграфа краязнаўцы.

Заданні, якія выконваюць студэнты, паступаюць і па заказах бібліятэк. Актыўна вядзецца гэта работа ў рамках вучэбна-вытворчага комплексу «Мінская абласная бібліятэка імя А. С. Пушкіна – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў». У рамках дысцыплін спецыялізацыі будзе выконвацца міжнародны карпаратыўны праект па стварэнні рэфератыўнай базы даных «Белорусские смоляне, смоленские белорусы», ініцыіраваны бібліятэкай Смаленскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пазааўдыторная самастойная работа студэнтаў ахоплівае такія традыцыйныя формы, як выкананне пісьмовых работ, вуснае апытанне, індывідуальныя гутаркі, кансультацыі, тэсціраванне і інш. Але асноўнымі сталі заданні, якія патрабуюць выкарыстання аўтаматызаваных тэхналогій, рэалізацыі творчых здольнасцей, імкнення да інавацый. Па бібліятэчна-бібліяграфічным краязнаўстве студэнты ўсіх спецыялізацый і форм навучання праходзяць практыку, пішуць курсавыя і дыпломныя работы, выступаюць з навуковымі дакладамі на канферэнцыях, друкуюць артыкулы, удзельнічаюць у нацыянальных конкурсах навуковых студэнцкіх работ, нярэдка выконваюць цікавыя і ўнікальныя работы, запатрабаваныя ў бібліятэках. Пералічаныя метады і формы навучання накіраваны на фарміраванне ў студэнтаў вопыту вырашэння разнастайных творчых, нестандартных задач і выкананне сацыяльна-прафесійных функцый на аснове атрыманых ведаў. У цэлым пры вывучэнні дысцыплін бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства ствараецца асяроддзе адукацыйных зносін, якое характарызуецца адкрытасцю, студэнты маюць магчымасць ўзаемадзейнічаць, назапашваць веды і практычныя ўменні, запатрабаваныя сучаснай перадавой практыкай краязнаўчай бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці і скіраваныя на яе ўдасканаленне. Разам з тым ёсць і шэраг пытанняў, якія ў адукацыйным працэсе не знайшлі адназначнага вырашэння. Сярод іх – недаацэнка асобнымі студэнтамі складанасці вучэбнай працы, што прыводзіць да нізкіх канчатковых вынікаў; недахоп персанальных камп'ютараў у Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна; неабходнасць большай актыўнай прамоцыі лепшых узораў работ студэнтаў у бібліятэчную практыку і ўвядзенне дысцыпліны «Бібліятэчна-бібліяграфічнае краязнаўства» ў вучэбны план студэнтаў спецыялізацыі АБІС, для якіх яго змест, як і практычная краязнаўчая дзейнасць бібліятэк, актуальныя.

У цэлым у працэсе выкладання дысцыплін бібліятэчна-бібліяграфічнага краязнаўства фарміруюцца функцыянальнасць і структурныя кампаненты прафесійнай кампетэнцыі будучага бібліятэкара, здольнасці да прыняцця эфектыўных рашэнняў у нестандартных сітуацыях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Жук, О. Л.* Компетентностный подход в высшем профессиональном образовании / О. Л. Жук // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 12. – С. 41–48.

2. *Галковская, Ю. Н.* Методика формирования профессионально ориентированной правовой компетенции библиотекаря-библиографа / Ю. Н. Галковская // Якасць вышэйшай адукацыі: сучасны стан і тэндэнцыі развіцця : матэрыялы навук.-метад. канф., 4–5 лют. 2014 г. – Мінск : БДУКМ, 2015. – С. 98–103.

**В. В. Сащеко,**
*доцент кафедры театрального творчества,*
*кандидат культурологии*

## ТЕАТРАЛЬНАЯ ПЕДАГОГИКА: РОЛЬ ПЕДАГОГА В ФОРМИРОВАНИИ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ КОМПЕТЕНЦИИ ВЫПУСКНИКА

Главная задача современного образовательного процесса – сформировать способности самостоятельно и успешно решать профессиональные задачи на основе знаний, умений и навыков, полученных им во время обучения. Ведущую роль в формировании этих способностей играет педагог. При этом следует отметить, что в театральной педагогике зависимость компетенции учащегося от педагога более высокая, чем во многих других сферах: педагог сопровождает профессиональное развитие ученика в течение нескольких лет, а не только на протяжении года-полугода.

В отечественной театральной педагогике прочно закрепилось понятие «мастер». Попробуем понять его сущность и определить роль в формировании профессиональной компетенции ученика, а также общую миссию в системе театрального искусства.

Как правило, под мастером понимают педагога, возглавляющего и осуществляющего художественное руководство учебным театральным коллективом. Само понятие «мастерство» предполагает способность качественно и результативно осуществлять определенную деятельность. В случае с педагогом-мастером театрального коллектива эта деятельность включает два неразрывно связанных базовых компонента: театраль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ